половина депутатов избирались по мажоритарной системе, а вторая половина — по системе пропорционального представительства. Но с 2005 г. все существенно меняется. Вступает в силу Федеральный закон «О выборах депутатов Государственной Думы Федерального собрания Российской Федерации» от 18 мая 2005 г. с последующими изменениями в 2007 г. Естественно, главное новшество закона — это введение пропорциональной системы выборов депутатов Государственной Думы. Также поднимается порог прохождения партий в Государственную Думу (с 5 до 7 %), отменены: порог явки; институт выборов руководителей субъектов Российской Федерации; голосование против всех кандидатов; широко применяется государственная автоматизированная система Российской Федерации «Выборы», обеспечившая сбор и суммирование данных об итогах голосования, их представление общественности через телевидение, радио, Интернет и мобильную связь.

Все эти нововведения оцениваются среди ученых и специалистов по конституционному праву неоднозначно. Избирательная система изменялась постоянно на протяжении ряда лет. Эти изменения являлись логическим продолжением политического развития страны. Какова власть, такова и мера свободы, т.е. выборы — это волеизъявление народа, его свободный выбор пути развития.

Сегодня, по мнению многих ученых, мы являемся свидетелями нового четвертого этапа в развитии российской избирательной системы, трудно пока его охарактеризовать однозначно.

***М.Ю. Колцінаў***
БДЭУ (Мінск)

## «ЗАСТАВА» ЯК ВІД ЗАЛОГА Ў ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ

На сучасным этапе развіцця ў Рэспубліке Беларусь вельмі важнае значэнне пачынае атрымліваць задача забеспячэння эфектыўнага выкарыстоўвання рэсурсаў, якія знаходзяцца ў маёмасці дзяржавы. Таму адной з найбольш актуальных задач сучаснага этапа рэфармавання заканадаўства з'яўляецца ўдасканальванне прававога рэгулявання залога нерухомай маёмасці. Мадэрнізацыя гэтага інстытута магчыма толькі з улікам гістарычнага вопыту папярэдніх этапаў развіцця беларускай дзяржавы.

Адзін з найбольш цікавых этапаў развіцця беларускага залогавага права звязан з гісторыяй ВКЛ у XVI ст. Статутнае заканадаўства нашай дзяржавы таго часу даволі падрабязна рэгламентавала праваадносіны, якія вынікалі з залога — перадачы рэчы ў валоданне залогатрымальніка без права яе адчужэння. У сувязі з тым, што ў залогавым праве ўтрымліваецца магчымасць пераходу права ўласнасці да крэдытора (у выпадку невыканання або пратэрміноўкі дагавора), аддаваць у залог

маёмасць магла толькі асоба, якая мела права адчужаць яе. Разглядаючы нормы Статутаў 1529, 1566 і 1588 гг., можна выдзяліць некалькі відаў залога. Адзін з іх — залог нерухомай маёмасці, перш за ўсё залог зямлі і маёнткаў, насіў назву «застава». Пры заставе да крэдытора пераходзілі ўсе правы на землеўладанне і перададзеных разам з маёмасцю людзей. Дагавор аб заставе мог быць двух формаў — без вызначэння і з вызначэннем тэрміну выплаты крэдыту пад умову яго страты ў выпадку невыплаты ў адзначаны ў дагаворы тэрмін. На дагавор не распаўсюджвалася іскавая даўнасць. У выпадку, калі залогатрымальнік адмаўляўся прыняць грошы ад залогадавальніка і вярнуць закладзеную маёмасць, «врад» уводзіў уласніка ў валоданне маёнткам, а крэдытор атрымліваў грошы праз мясцовую адміністрацыю. У выпадку смерці даўжніка да тэрміну выплаты грошаў, яго нашчадкі маглі выкуніць закладзеную маёмасць без тэрміну земскай даўнасці.

Залогатрымальнікам перадаваліся не толькі землі прыватных асоб, але і землі Вялікага князя, якія з'яўляліся дзяржаўнай маёмасцю. М.К. Любаўскі лічыў, што прыцягненне асабістых крэдытаў пад залог дзяржаўных зямель звязана з выкарыстоўваннем польскага вопыту. Аднак вопыт Польшчы мог паўплываць на маштаб уяўлення, але ж не быў крыніцай яго зараджэння. Такая практыка зараджалася самастойна ў ВКЛ. Аб гэтым сведчыць грамата, выданая Вялікім князем Вітаўтам пану Бедрыху каля 1429 г. Узяўшы ў пана вялізную колькасць грошаў, Вітаўт перадаў крэдытору ў валоданне два селішча і «запісаў» на іх гэтыя грошы.

На падставе аналізу актаў Літоўскай метрыкі можна прыйсці да высновы, што менавіта ў пачатку XVI ст. пры княжанні Вялікіх князёў Аляксандра і Жыгімонта Старога заклад дзяржаўных зямель атрымаў найбольшае распаўсюджанне. Гэтаму спрыялі знешнепалітычныя падзеі: узброеныя канфлікты з Маскоўскай дзяржавай, на вядзенне якіх Вялікаму князю патрабаваліся значныя сродкі, якія здабываліся пуцём прыцягнення сродкаў багатых паноў. Вядомы беларускі вучоны В.І. Пічэта лічыў, што залог вялікакняжацкіх маёнткаў у асноўным прыходзіцца на 1516–1529 гг. І.Г. Яцкевіч удасканаліў і выдзяліў некалькі найбольш інтэнсіўных перыядаў: 1505–1506, 1516, 1518–1519 гг. У наступным у асноўным адбываліся перазаклады «заставленых» маёнткаў, павелічэнне колькасці пазычаных грошаў і выкуп закладзенай маёмасці. Залогатрымальнік не толькі атрымліваў права патрабаваць выканання ў поўным аб'ёме традыцыйных работ ад падуладных людзей, але і збіраць усе вялікакняжацкія падаткі і іныя прыбыткі.

Такім чынам, залогавае права ВКЛ XVI ст. было добра развіта для свайго часу. Яно характарызавалася зразумеласцю і дакладнасцю фармуліровак, распрацаванасцю тэрміналогіі. Статутнае залогавае права спрыяла дальнейшаму развіццю нашай дзяржавы. Некаторыя яго нормы дзейнічалі на працягу 250 гадоў. Такім чынам, пры мадэрнізацыі сучаснага беларускага залогавага заканадаўства неабходна ўлічваць вопыт папярэдніх перыядаў развіцця беларускага права, у тым ліку статутнага права ВКЛ XVI ст.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by